# Навіны пачтовой сувязі Беларусі

На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь сетка паштовай сувязі налічвае **болей 4 тысяч аб'ектаў паштовай сувязі**.

У Рэспубліцы Беларусь ліцэнзію на аказанне паслуг паштовай сувязі агульнага карыстання па перасылцы паштовых адпраўленняў, прыёме падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі і іх дастаўцы маюць **28** аператараў паштовай сувязі.

Да наваўвядзенняў і дасягненняў у сферы паслуг паштовай сувязі, рэалізаваным за апошні час на базе IT-тэхналогій, адносяцца развіццё нацыянальнай паштовай электроннай сістэмы, электроннай авансавай сістэмы, сэрвісаў «Мабільны паштальён» і прадпаштовай апрацоўкі, а таксама пашырэнне сеткі паштаматаў.

**Нацыянальная паштовая электронная сістэма** – гэта зручны і хуткі спосаб перасылкі простых і заказных лістоў у электроннай і гібрыднай форме з пацвярджэннем факта ўручэння. Колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў у сістэме складае больш за **5 450** карыстальнікаў.

**Электронная авансавая сістэма** разліку для юрыдычных асоб – гэта аблічбаваны аналаг папяровай авансавай кніжкі, які дазваляе ажыццяўляць online залічэнне і спісанне грашовых сродкаў за паслугі паштовай сувязі, а таксама аплачваць шырокі спектр паслуг паштовай сувязі. Колькасць заключаных дагавораў на аказанне паслуг з выкарыстаннем электроннай авансавай сістэмы складае больш за **18 700** штук.

**Сэрвіс «Мабільны паштальён»** дазволіў забяспечыць населеныя пункты, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, шырокім спектрам паслуг па-за аб'ектам паштовай сувязі, у тым ліку паслугі паштовай сувязі, банкаўскія, фінансавыя і іншыя паслугі. У цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь функцыянуе больш за **6 130 адзінак**.

Для развіцця дадатковага кругласутачнага канала атрымання паштовых паслуг, павышэння ўзроўню абслугоўвання карыстальнікаў і скарачэння іх часу чакання пры атрыманні паштовых адпраўленняў працягваецца пашырэнне сеткі і функцыянальных магчымасцей **паштаматаў**. Сетка паштаматаў Рэспублікі Беларусь у цяперашні час складае больш за **150 адзінак**.

**Прадпаштовая апрацоўка** – online сэрвіс, які забяспечвае магчымасць выдаленага афармлення паштовых адпраўленняў, друк неабходнай суправаджальнай дакументацыі, паскоранае афармленне паштовага адпраўлення па штрых-кодзе ў аб'екце паштовай сувязі або паштамаце.

Працягваецца развіццё **паштовай інтэрнэт-крамы Shop.belpost.by**, галоўнай задачай якога з'яўляецца дыстанцыйны гандаль таварамі і паштовай прадукцыяй з дастаўкай насельніцтву ў любую кропку Беларусі, а таксама ў больш як 40 краін замежжа. На афіцыйным сайце нацыянальнага аператара паштовай сувязі прадстаўлена прадукцыя больш як 320 вытворцаў/пастаўшчыкоў і размешчана больш за **27 000 найменняў тавараў**.

4 чэрвеня 2024 года ў г. Мінск (Рэспубліка Беларусь) адбылося сумеснае 60-е пасяджэнне Савета кіраўнікоў Адміністрацый сувязі Рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі (РСС) і 30-е пасяджэнне Каардынацыйнага савета дзяржаў - удзельніц СНД па інфарматызацыі пры РСС

Малюнак




Source URL: *https://mpt.gov.by/naviny-pachtovoy-suvyazi-belarusi*